## Рэцэнзіі



# "Дзеля максімальна поўнага і аб'ектыўнага даследавання мінулага беларускага народа..."

Менавіта такую задачу паставіў перад сабой аўтарскі калектыў пад кіраўніцтвам акадэміка М.П.Касцюка, рыхтуючы **шасцітомнае выданне "Гісторыя Беларусі"**. У склад аўтарскага калектыву ўвайшлі як супрацоўнікі Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, так і выкладчыкі шэрага ВНУ рэспублікі. У 2000 г., праз чвэрць стагоддзя пасля выхаду 5-га тома калектыўнай працы "Гісторыя Беларускай ССР" (1975 г.), у выдавецтве "Экаперспектыва" пабачыў свет першы том новага грунтоўнага выдання.




Неабходнасць яго падрыхтоўкі была абумоўлена шэрагам прычын. Галоўная з іх заключалася ў тым, што з абвяшчэннем незалежнасці Рэспублікі Беларусь патрэбна было грунтоўнае пераасэнсаванне шматвяковага гістарычнага мінулага беларускага народа.

У многіх чытачоў можа справядліва ўзнікнуць пытанне: *"Чым жа істотна адрозніваецца шасцітомная "Гісторыя Беларусі" (2000—2011 гг.) ад пяцітомнай "Гісторыі Беларускай ССР" (1972—1975 гг.), што ў ёй прынцыпова новага?"*

У першую чаргу, гэта адрозненні канцэптуальнага характару. Калі ў савецкім пяцітомніку гісторыя беларускага народа асвятлялася з метадалагічных пазіцый марксісцка-ленінскай ідэалогіі, то ў шасцітомніку аўтары адышлі ад састарэлых установак, каб наблізіцца да аб'ектыўнага разгляду гісторыі.

У пачатку 1990-х гг. даследчыкі атрымалі магчымасць больш шырока карыстацца тымі архіўнымі фондамі, якія раней па розных прычынах былі недаступныя. Перш за ўсё гэта фонды Цэнтральнага архіва КДБ Рэспублікі Беларусь і Дзяржаўнага архіва Расійскай Федэрацыі, многія замежныя архівы. У выніку значна пашырылася база крыніц — архіўных, музейных, зборнікаў дакументаў, мемуараў, кандыдацкіх і доктарскіх дысертацый, матэрыялаў перыядычнага друку.

Калі ў пяцітомніку "Гісторыя Беларускай ССР" адсутнічае асобны разгляд гістарыяграфіі і крыніц, то ў кожным з шасці тамоў новага выдання маецца грунтоўны гістарыяграфічны і крыніцазнаўчы агляд. Пры гэтым аўтары спасылаюцца на публікацыі на розных мовах — польскай, літоўскай, украінскай, нямецкай і англійскай. У пяцітомніку толькі ў першым томе была выкарыстана літаратура на польскай мове.

Змяніўся і аб'ём, які адводзіцца на тыя ці іншыя гістарычныя падзеі. У савецкі час уся гісторыя Беларусі ад старажытнасці да Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. была ўціснута ў 2 тамы, а падзеям XX ст. аддаваліся 3 тамы. У новым жа выданні такая храналагічная дыспрапорцыя ліквідавана: на падзеі са старажытнасці да 1917 г. адведзена 4 з 6 тамоў. Да таго ж, аўтарамі дадзенага выдання ўзняты тыя праблемы, якія па розных аб'ектыўных і суб'ектыўных прычынах не маглі быць даследаваны да абвяшчэння незалежнасці Рэспублікі Беларусь.

Паспрабуем прааналізаваць тэкст новага шасцітомнага выдання па асобных тамах.

У **першым томе "Старажытная Беларусь. Ад першапачатковага засялення да сярэдзіны XIII ст."** (рэдактары М.Чарняўскі і Г.Штыхаў) разглядаецца мінулае нашай Бацькаўшчыны ў першабытны і раннесярэдневяковы перыяды (каля 100 тыс. гадоў таму — першая палова XIII ст.) — ад першапачатковага засялення тэрыторыі Беларусі да фарміравання і развіцця першых дзяржаўных утварэнняў. Тэкст напісаны ў асноўным на падставе аналізу шматлікіх археалагічных матэрыялаў. У гэтым томе ўся гісторыя першабытнага грамадства на сучасных беларускіх землях паўстае як шматгранны і складаны працэс.

Да несумненных вартасцей першага тома трэба аднесці: 1) зварот аўтараў да канцэпцый паходжання беларускага этнасу — "балцкага субстрату" і "старажытнарускай" народнасці; 2) падкрэсліванне важ-

най ролі хрысціянства ў культурным жыцці грамадства перыяду Ранняга сярэдневякоўя; 3) падрабязны разгляд працэсу ўзнікнення першых дзяржаўных утварэнняў на беларускіх землях.

Значную цікавасць уяўляе глава 3 раздзела 2 "Эканамічныя ўклады, грамадскі лад, гаспадарка ў IX—XIII стст.". У адрозненне ад выдання 1970-х гг. тут уздымаецца пытанне пра шматукладны характар гаспадаркі на беларускіх землях у разглядаемы перыяд.

Ёсць, аднак, і заўвагі да аўтараў першага тома. Ва ўступе да яго, пры характарыстыцы абагульняючых прац першай чвэрці XX ст. па гісторыі Беларусі, разглядаюцца працы В.Ластоўскага "Кароткая гісторыя Беларусі" (1910 г.), У.Ігнатоўскага "Кароткі нарыс гісторыі Беларусі" (1919—1926 гг.), М.Доўнар-Запольскага "Гісторыя Беларусі" (Мн., 1994), аднак не названы творы аднаго з заснавальнікаў беларускай гістарычнай навукі У.Пічэты — "Курс белорусоведения. Лекции, читанные в Белорусском народном университете в Москве летом 1918 года" (М., 1918—1920) і абагульняючая праца "Гісторыя Беларусі. Ч.1" (М.-Л., 1924). Па-за ўвагай аўтараў засталіся і некаторыя абагульняючыя працы, апублікаваныя ў 1930-я—1940-я гг.

Гісторыі Вялікага Княства Літоўскага з моманту яго заснавання і да Люблінскай уніі 1569 г. прысвечаны **другі том "Беларусь у перыяд Вялікага Княства Літоўскага"** (рэдактары Ю.Бохан і Г.Галенчанка).

Вельмі важнымі з'яўляюцца выказаныя думкі, што беларускія землі ў многіх адносінах вызначалі сутнасць, накіраванасць, характар гэтай магутнай еўрапейскай дзяржавы — Вялікага Княства Літоўскага, што беларускія землі і ў пэўнай ступені іншыя ўсходнеславянскія землі былі тэрытарыяльнай, дэмаграфічнай, гаспадарчай, ваеннай, фінансавай, духоўнай асновай ВКЛ. Менавіта тут знаходзіліся вялізныя магнацкія і царкоўныя латыфундыі, існавалі буйныя гарады. Гэтыя землі зведалі асноўны цяжар доўгага і драматычнага для ўсіх бакоў супрацьстаяння ВКЛ з Вялікім Княствам Маскоўскім у XV—XVI стст.

Асабліва каштоўнымі трэба лічыць высновы, што ў гэты перыяд продкі сучасных беларусаў пачалі асэнсоўваць сябе цэласным народам са сваёй гістарычнай спадчынай, культурай, светапоглядам, звычаямі і побытам, што менавіта іх здзяйсненні нямала садзейнічалі стварэнню разам з літоўцамі і некаторымі іншымі народамі новай поліэтнічнай дзяржавы на балцка-славянскіх абшарах.

Прынцыпова новым з'яўляецца разгляд этнакультурных працэсаў і развіцця царкоўна-рэлігійных адносін у рэчышчы агульнаеўрапейскіх працэсаў. Пры разглядзе гісторыі гарадоў і мястэчак Беларусі ў XV—XVI стст. асаблівая ўвага надаецца ўсебаковаму асвятленню ўрбанізацыйных працэсаў.

Нельга не пагадзіцца з думкай аўтараў другога тома, што ВКЛ адыгрывала адметную ролю ва Усходняй Еўропе не толькі сваімі памерамі і грамадска-палітычным ладам, але і таму, што стала першым збіральнікам раздробленых зямель Заходняй Русі, паказала рэальную магчымасць шырокіх дзяржаўных і шматэтнічных утварэнняў, стымулявала развіццё цэнтраімклівых працэсаў сярод "буферных" прамежкавых княстваў (Цвярское, Чарнігаўскае, Смаленскае і іншыя), а таксама на землях Паўночна-Усходняй Русі.

У ВКЛ упершыню ва Усходняй Еўропе ў XV—XVI стст. сфарміраваўся своеасаблівы дзяржаўна-палітычны лад еўрапейскага тыпу, іншы, чым у Паўночна-Заходняй Русі. Менавіта на беларускіх і літоўскіх землях раней і адметней, чым у Вялікім Княстве Маскоўскім і ўкраінскіх землях праявіліся прыметы еўрапейскага Рэнесансу, узнікла кірылічнае кнігадрукаванне, распаўсюдзіліся ўніверсітэцкая адукацыя, шматмоўная літаратура і пісьменнасць, рэфармацыйныя рухі.

У той жа час, аналізуючы этнакультурныя працэсы ў ВКЛ у XVI ст., аўтары тома не ўзгадваюць даследаванні У.Пічэты па гэтай праблеме, такія, як артыкулы "Образование белорусского народа" (у часопісе "Вопросы истории", 1946, № 5—6) і "Культура Белоруссии XVI в." (у кнізе "Белоруссия и Литва XV—XVI вв". М., 1961).

**Трэці том "Беларусь у часы Рэчы Паспалітай (XVII—XVIII стст.)"** (рэдактары Ю.Бохан, П.Лойка) асвятляе перыяд знаходжання беларускіх зямель у складзе Рэчы Паспалітай. У ім адлюстраваны важнейшыя пытанні ўнутранага і знешнепалітычнага жыцця дзяржавы "двух народаў", якія тычыліся беларускіх зямель, асноўныя напрамкі сацыяльна-эканамічнага і культурнага развіцця Беларусі. Аўтары слушна адзначаюць, што шматлікія войны прывялі да зруйнавання беларускіх гарадоў і вёсак; у выніку гэтага адбылося змяненне іх этнічнага аблічча з-за змяншэння колькасці мяшчан-беларусаў. Гэты працэс разам з апалячваннем вышэйшага саслоўя — шляхты — прывёў да паступовага пераўтварэння беларусаў у "сялянскую" нацыю, а таксама да аслаблення ўплыву беларускіх фактараў на фарміраванне "высокай культуры".

Аўтары тома справядліва лічаць, што паваротным пунктам у гісторыі беларускіх зямель стала казацка-сялянская вайна 1648—1651 гг. Вайна 1654—1667 гг. названа ў новым выданні "вайной Расіі з Рэччу Паспалітай" у адпаведнасці з новым падыходам (у выданні 1970-х гг. яна называлася "руска-польская" і характарызавалася як "барацьба беларускага народа за ўз'яднанне з Расіяй").

Аўтары адзначаюць трагічныя вынікі вайны Расіі з Рэччу Паспалітай 1654—1667 гг. і Паўночнай вайны 1700—1721 гг. для Беларусі, тэрыторыя якой з'яўлялася асноўнай арэнай баявых дзеянняў: катастрафічна скарацілася колькасць жыхароў беларускіх гарадоў і вёсак, эканоміка прыйшла ў заняпад, што прывяло да пагаршэння становішча беларускага сялянства і нараджала сацыяльны пратэст, які выяўляўся ў розных формах.

У той час, як у выданні 1970-х гг. паўстанне 1794 г. пад кіраўніцтвам Тадэвуша Касцюшкі ўзгадвалася літаральна адным сказам, то ў рэцэнзуемым выданні

гэтай важнай гістарычнай падзеі прысвечаны параграф "Паўстанне 1794 г. у Беларусі. Трэці падзел Рэчы Паспалітай" (с. 245—259), дзе разглядаюцца падрыхтоўка паўстання, пачатак узброенай барацьбы, асаблівасці паўстання ў Беларусі і Літве, выкарыстанне партызанскай тактыкі ў змаганні супраць расійскіх войскаў і прычыны паражэння.

У адрозненне ад пяцітомнага выдання 1970-х гг., дзе працэсы канца XVIII ст. разглядаліся як "уз'яднанне Беларусі з Расіяй", у выданні 2000-х гг. выкарыстоўваюцца паняцці "ўключэнне зямель Беларусі ў склад Расійскай імперыі" і "адыход да Расіі зямель Беларусі".

У трэцім томе зроблена прынцыпова важная высnова, што падзелы Рэчы Паспалітай з'явіліся лагічным завяршэннем глыбокага палітычнага крызісу, у якім знаходзілася гэтая дзяржава з сярэдзіны XVIII ст. Перадумовы гэтага крызісу былі закладзены раней і выявіліся ў паступовым аслабленні ўлады манархаў. Найбольш яскрава гэта праявілася ў існаванні права "iiberum veto", якое фактычна паралізавала заканадаўчую дзейнасць у Рэчы Паспалітай.

На аснове аналізу шматлікіх крыніц аўтары тома прыйшлі да высновы, што ў перыяд XVII—XVIII стст. адбывалася апалячванне насельніцтва беларускіх зямель.

Знаходжанню беларускіх зямель у складзе Расійскай імперыі прысвечаны **чацвёрты том** рэцэнзуемага выдання **"Беларусь у складзе Расійскай імперыі. Канец XVIII—пачатак XX ст."** (рэдактары В.Яноўская і С.Рудовіч).

Ва ўступе да яго справядліва адзначаецца, што ў пачатку XIX ст. *"Беларусь аказалася месцам гістарычнай сустрэчы і ўзаемадзеяння еўрапеізаваных норм жыцця з тымі сацыяльна-палітычнымі і культурнымі стандартамі, што панавалі ў еўрапейска-азіяцкай імперыі Раманавых. З гэтага часу асноўнай тэндэнцыяй стала паступовая пераарыентацыя Беларусі з заходняга на ўсходні вектар развіцця".*

Далучэнне беларускіх зямель да Расійскай імперыі дало імпульс развіццю гуманітарных навук. Пачалося комплекснае даследаванне гісторыі, мовы, матэрыяльнай і духоўнай культуры беларускага этнасу, абумоўленае палітычнымі і эканамічнымі інтарэсамі расійскіх улад.

Заслугоўвае ўвагі выснова аўтараў, што сацыяльная мадэрнізацыя грамадства на рубяжы XIX—XX стст. прывяла да абвастрэння палітычнай барацьбы, з'яўлення шматлікіх палітычных партый, арганізацый, агульнага ўздыму грамадскага руху. На самай справе ў сацыяльных умовах беларускай рэчаіснасці эканамічныя пытанні былі цесна звязаны з нацыянальнымі праблемамі. Асноўныя перадумовы палітычнага крызісу расійскага самадзяржаўя вызначаліся так званым "польскім пытаннем", а крыху пазней — яўрэйскім і беларускім пытаннямі.

Заўважым, што пры характарыстыцы ваенных падзей 1812 года ў Беларусі аўтары адмовіліся ад назвы "Айчынная вайна". Фактычна новым сюжэтам з'явіўся разгляд этнічнага складу насельніцтва і этнадэмаграфічных працэсаў на беларусіх землях у канцы XIX—пачатку XX ст.

У чацвёртым раздзеле тома адлюстроўваюцца суадносіны паміж рэфармісцкім і рэвалюцыйным шляхамі пераўтварэння беларускага грамадства ў 1901—лютым 1917 гг. У параўнанні з выданнем 1970-х гг. тут больш падрабязна аналізуюцца новыя з'явы ў эканоміцы, супярэчнасці палітыкі самадзяржаўя на беларускіх землях. Больш выразна і аб'ектыўна паказана ўзнікненне і дзейнасць розных палітычных партый і арганізацый. Прынцыпова важна, што ў кнізе разгледжана гісторыя беларускага нацыяльна-палітычнага і культурна-асветніцкага руху, паказана барацьба за аднаўленне беларускай дзяржаўнасці, адлюстраваны асаблівасці нацыятворчых працэсаў. Па-новаму раскрыты таксама масавая эміграцыя з Беларусі ў XIX—пачатку XX ст. і пачатак фарміравання за мяжой беларускай дыяспары.

Адзначаючы наватарскі падыход аўтарскага калектыву да асвятлення многіх пытанняў гісторыі гэтага перыяду, трэба заўважыць, што пры гістарыяграфічным аналізе становішча беларускіх зямель у складзе Расійскай імперыі сярод работ, прысвечаных нацыянальным меншасцям, не ўзгаданы публікацыі па гісторыі і культуры яўрэяў на беларускіх землях. Адсутнічае таксама шэраг прац У.Пічэты, прысвечаных сялянскаму руху, класавым супярэчнасцям напярэдадні рэвалюцыі 1905 г. і дзейнасці палітычных партый.

Разглядаючы канфесійную і нацыянальную палітыку царскага ўрада ў беларуска-літоўскіх губернях на працягу 1772—1825 гг., аўтар А.Філатава адзначае, што гэтая палітыка *"не была выразна акрэсленна"*. А далей канстатуецца, што *"нязменнай заставалася яе сутнасць: замацаванне Расіі на новадалучаных землях, усталяванне пануючай ролі праваслаўя на гэтай тэрыторыі, падпарадкаванне ўсіх катэгорый мясцовага насельніцтва ўладзе Расійскіх імператараў"* (с. 75).

У **пятым томе "Беларусь у 1917—1945 гг."** (рэдактар М.Касцюк) чытач мае магчымасць пазнаёміцца з шэрагам новых тэм і сюжэтаў. Так, праводзіцца грунтоўнае пераасэнсаванне характару і сутнасці падзей, якія адбываліся на беларускіх землях у лістападзе 1917 г. — студзені 1918 г. Значную цікавасць уяўляюць сюжэты пра Беларускую Народную Рэспубліку і Слуцкае паўстанне 1920 г., пра ажыццяўленне палітыкі беларусізацыі — *"краевугольнага каменя нацыянальнага адраджэння"*. У дадзеным томе яна ўсебакова разглядаецца ў асобным раздзеле "Беларусізацыя як галоўнае звяно дзяржаўнай нацыянальнай палітыкі" (с. 216—225). Аўтары прыходзяць да высновы, што *"праводзімая ў сярэдзіне 20-х гг. палітыка беларусізацыі ... мела часовы, кан'юнктурны характар"* (с. 568—569).

Асобны параграф прысвечаны падзеям, звязаным з заключэннем Рыжскага мірнага дагавора 1921 г. У кнізе надрукаваны загад камандуючага войскамі Заходняга фронту М.Тухачэўскага ад 12 жніўня 1920 г. пра стварэнне Часовага ваенна-рэвалюцыйнага ка-

якую праводзіла ў 1947—1950 гг. тагачаснае кіраўніцтва БССР на чале з першым сакратаром ЦК КПБ М.І.Гусаравым. Яны разглядаюцца ў параграфах "Барацьба з "пакланеннем і нізкапаклонствам" перад Захадам" і "Антысеміцкая кампанія". У іх адзначаецца, што першыя пасляваенныя гады характарызаваліся разгортваннем у краіне антысеміцкай кампаніі, наступленнем на яўрэйскую культуру, што было звязана з ростам нацыянальнай свядомасці савецкіх яўрэяў пад уплывам працэсу станаўлення яўрэйскай дзяржавы.

Нельга не пагадзіцца з думкамі аўтараў, што з сярэдзіны 1950-х гг. для беларускага народа адкрыўся новы гістарычны этап. Закрыты характар савецкага, у тым ліку беларускага, грамадства прыводзіў да яго адрыву ад еўрапейскай і сусветнай супольнасці, кансервацыі тых форм жыцця, якія існавалі.

Пасля XX з'езда КПСС у 1956 г. адбылося пэўнае пераасэнсаванне ролі вярхоўнага кіраўніцтва краіны ў грамадскім развіцці, аднак не былі закрануты асновы савецкага ладу жыцця — аднапартыйная сістэма, высокая ступень цэнтралізацыі ў кіраванні сацыяльна-эканамічнымі, грамадска-палітычнымі і культурнымі працэсамі, абмежаванні ў развіцці ўсяго нацыянальнага.

У другім раздзеле звернута ўвага на непаслядоўнасць і незавершанасць новых падыходаў да ўдасканалення гаспадарчага комплексу. Значнай навізной вылучаецца глава чацвёртая "Кольканыя і этнасацыяльныя змяненні ў складзе насельніцтва".

Трэці раздзел утрымлівае шэраг новых сюжэтаў, прысвечаных палітычнаму стану грамадства, у тым ліку і такой з'яве, як дысідэнцтва; дэмаграфічным і этнасацыяльным зменам на працягу 1971—1991 гг.; адукацыйна-культурнай сферы; рэлігійнаму жыццю і міжнародным стасункам.

Асаблівую цікавасць мае глава "Беларускае грамадства ў часы перабудовы", дзе знайшлі адлюстраванне пытанні мадэрнізацыі савецкага гаспадарчага механізму, пачатак рэфармавання палітычнай сістэмы і працэсы дэмакратызацыі, катастрофа на Чарнобыльскай АЭС.

У канцы 1980-х — першай палове 1990-х гг. склаліся спрыяльныя ўмовы для новага этапу нацыянальнага адраджэння. У гэты час пашырылася ўжыванне беларускай мовы, былі рэабілітаваны многія беларускія дзеячы, якія сталі ахвярамі палітычных рэпрэсій, у грамадскім жыцці зменшылася роля камуністычнай ідэалогіі.

Упершыню ў калектыўным шматтомным выданні разглядаецца гістарычны шлях Беларусі на працягу 1991—2009 гг. Цікавасць уяўляюць параграфы, прысвечаныя спробам укаранення інавацыйных тэхналогій у прамысловасць, раскрыццю ролі культуры ў захаванні нацыянальнай самабытнасці беларускага народа, а таксама становішчу Беларусі ва ўмовах сусветнага фінансава-эканамічнага крызісу.

Аўтары справядліва адзначаюць, што 1990-я—2000-я гг. па свайму зместу даволі выразна падзяляюцца на два этапы — парламенцкага кіравання (да сярэдзіны 1994 г.) і ўстанаўлення прэзідэнцкага праўлення (сярэдзіна 1994—2009 гг.). Калі на першым этапе ва ўмовах крызісных з'яў адбываліся радыкальныя пераўтварэнні ў грамадска-палітычнай і сацыяльна-эканамічнай сферах, то на другім адбывалася фарміраванне беларускай мадэлі сацыяльна-эканамічнага развіцця.

Хацелася б выказаць і некаторыя пажаданні аўтарам кнігі.

Выкарыстоўваючы ўспаміны і публікацыі дзяржаўна-партыйных кіраўнікоў Беларусі М.Патолічава, К.Мазурава, П.Машэрава і В.Кебіча, аўтарам неабходна было б звярнуцца таксама да апублікаваных ўспамінаў П.Панамарэнкі і М.Дземянцея. Таксама не былі ўведзены ў навуковы зварот мемуары міністра замежных спраў БССР К.Кісялёва "Записки советского дипломата" (М., 1974).

У чацвёртай главе "Дэмаграфічныя і этнасацыяльныя працэсы", на вялікі жаль, не прыведзена ніводнай спасылкі на архіўныя матэрыялы, адсутнічаюць канкрэтныя лічбы страт насельніцтва Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны (с. 118).

Выклікае пытанне сцвярджэнне аб тым, што *"паранейшаму на карэнных жыхароў падала прыкладна $^4/_5$ ... агульнай колькасці насельніцтва рэспублікі. Астатнюю частку складалі галоўным чынам палякі, рускія, украінцы, яўрэі, татары, літоўцы і латышы"* (с. 136). Аднак не толькі беларусаў, але і так званую "астатнюю частку" насельніцтва можна лічыць карэннымі жыхарамі, паколькі некалькі пакаленняў прадстаўнікоў адзначаных вышэй этнічных меншасцей спрадвеку жылі на беларускай зямлі. Да таго ж, незразумела, да якога года адносіцца адзначаны вышэй паказчык колькасці карэнных жыхароў.

У параграфах, прысвечаных рэлігійнаму жыццю ў БССР у 1950-я — 1980-я гг., разглядаецца становішча толькі хрысціянскіх канфесій (гл. с. 344—357, 504—521).

Нягледзячы на шэраг недахопаў, новае калектыўнае выданне з'яўляецца значным крокам у даследаванні гісторыі Беларусі з глыбокай старажытнасці да нашых дзён. Несумненнай заслугай аўтарскага калектыву з'яўляецца глыбокае навуковае асэнсаванне малавядомых і невядомых старонак шматвяковай гісторыі беларускага народа. Аўтарскаму калектыву ўдалося стварыць каштоўнае навуковае выданне, якое будзе карысна не толькі навукоўцам, выкладчыкам ВНУ, магістрам, аспірантам, студэнтам, але і шырокаму колу грамадскасці, усім, хто цікавіцца гісторыяй нашай Бацькаўшчыны.

**Эмануіл Іофе,**
*доктар гістарычных навук, прафесар,*
**Валянцін Мазец,**
*кандыдат гістарычных навук, дацэнт.*